


Уладзімір ДЗЮБА

## НАШЫ СЛАЎНЫЯ ТРОЕ

ХАЙ ТРАІМ КОСМАС
ЗОРЫЦЦА!..
ХАЙ ТРАІМ УСМІХАЕЦЦА!..
ДА НЯБЛІЗКІХ ГАЛАКТЫКАЎ
ЁН—ЯК ПЕРШАЯ СТАНЦЫЯ!.

НУ, А ЛЮДЗІ?.. ІМ ВЕРЫЦЦА,
ШТО СУЗОР'І ДАЛЕКІЯ —
ЯК АДКРЫТЫЯ ДЗВЕРЫ,
ТАЯМНІЧЫЯ ВОКНЫ.

НЕДЗЕ У ЦЕМРАДЗІ СТОЕНАЙ
ВОКНЫ СВЕЦЯЦЦА,
СВЕЦЯЦЦА...
НАШЫ СЛАЎНЫЯ ТРОЕ
ЗНОЎ ЛЯ ІХ НАВАСЕЛЬЦАМІ!..

# Героям космасу— Уладзіміру Камарову, Канстанціну Феакціставу, Барысу Ягораву— наша гарачае прывітанне!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА і ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (580) | Субота, 17 кастрычніка 1964 г. | Год выдання XVII-ы | Цана 1 кап.

## *ПАВЕДАМЛЕННЕ*

### Аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта КПСС

14 кастрычніка г. г. адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум ЦК КПСС задаволіў просьбу т. Хрушчова М. С. аб вызваленні яго ад абавязкаў Першага сакратара ЦК КПСС і Старшыні Савета Міністраў СССР у сувязі са старым узростам і пагаршэннем стану здароўя.

Пленум ЦК КПСС выбраў Першым сакратаром ЦК КПСС т. Брэжнева Л. І.

## У Прэзідыуме Вярхоўнага Савета СССР

15 кастрычніка г. г. пад старшынствам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. А. І. Мікаяна адбылося пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР разгледзеў пытанне аб Старшыні Савета Міністраў СССР.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР задаволіў просьбу тав. Хрушчова Мікіты Сяргеевіча аб вызваленні яго ад абавязкаў Старшыні Савета Міністраў СССР у сувязі са старым узростам і пагаршэннем стану здароўя.

Старшынёй Савета Міністраў СССР Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР назначыў тав. Касыгіна Аляксея Мікалаевіча, вызваліўшы яго ад абавязкаў першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР.

Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб вызваленні тав. Хрушчова М. С. ад абавязкаў Старшыні Савета Міністраў СССР і аб назначэнні тав. Касыгіна А. М. Старшынёй Савета Міністраў СССР прыняты членамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аднагалосна.

Члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР цёпла павіншавалі тав. Касыгіна А. М. з назначэннем на пасаду Старшыні Савета Міністраў СССР.

Тав. Касыгін А. М. сардэчна падзякаваў Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР за аказанае яму давер'е і запэўніў, што прыкладзе ўсе сілы для таго, каб выканаць ускладзеныя на яго абавязкі.

---

Сёлета будаўнікі парадавалі мінскіх студэнтаў: былі здадзены ў эксплуатацыю карпусы педагагічнага інстытута і інстытута замежных моваў. Пачалі будаваць корпус факультэта радыёфізікі і электронікі нашага ўніверсітэта.

Узрадаваліся студэнты і адкрыццю новага ўваходу ў студэнцкі гарадок універсітэта і медінстытута. Студэнт аддзялення журналістыкі В. Луцэнка зрабіў гэты здымак, калі група дзяўчат і юнакоў «абнаўляла» гэты ўваход. Сапраўды, добра, больш зручна стала.



## Заўтра—XIX камсамольская канферэнцыя ўніверсітэта!

Пачатак работы XIX камсамольскай канферэнцыі ўніверсітэта — заўтра, 18-га кастрычніка 1964 года, а 10 гадзіне ў актавай зале галоўнага корпуса ўніверсітэта.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ імя У. І. ЛЕНІНА.



Многія студэнты хімічнага факультэта актыўна працуюць у студэнцкіх навуковых гуртках. На здымку: камсорг 4-га курса Оля Шыцко і Жэня Гусеў (ён, дарэчы, працаваў брыгадзірам бетоншчыкаў на будоўлі «Міжкалгасбуда») за навуковымі даследаваннямі ў адной з лабараторый хімфака.

Фота В. Луцэнкі.

## Як праходзіў сход камсамольцаў юрфака

Важная роля ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў юрыстаў належыць камсамольскай арганізацыі юрыдычнага факультэта. Ці поўнасцю яна выконвае сваю задачу, можна адказаць, зрабіўшы хоць бы невялікі аналіз справаздачна-выбарчага сходу, што адбыўся 9 кастрычніка.

Зразумела, у цэлым камсамольская арганізацыя юрфака многае зрабіла для паляпшення паспяховасці, дысцыпліны студэнтаў, для паляпшэння грамадскай работы. Але сход паказаў, што ў дзейнасці камсамольскай арганізацыі маюцца сур'ёзныя хібы.

Па-першае, сам сход быў падрыхтаваны дрэнна. Пра студэнцкія лозунгі, дыяграмы, што расказвалі б пра работу арганізацыі, і гаварыць не прыходзіцца. Іх проста не было. І наогул на сходзе адчувалася нейкая абыякавасць нават элемент стыхійнасці, і гэта прывяло да таго, што дакладчык, былы сакратар камітэта камсамола юрфака Яўген Кавалёў, атрымаў не 45 хвілін, як прасіў, а 30. У выніку, даклад быў «згорнуты». Выступаючых знайшлося 4—5 чалавек, і сход прайшоў вяла і нецікава.

Усё гэта атрымалася большай часткай па віне членаў былога камітэта камсамола. Асноўная адказнасць за правядзенне сходу ляжала на іх. Члены камітэта рана здалі свае пазіцыі, адыйшлі ў бок і ўсклалі ўсю падрыхтоўку справаздачна-выбарчага сходу на Яўгена Кавалёва.

Інакш не прыйшлося б намеснікам сакратара Валерыю Сысуеву і Дзіму Чубу ледзь не па закліку старшынствуючага выступаць самім.

Але на сходзе было і праяўленне недысцыплінаванасці, нетактоўнасці некаторымі камсамольцамі. Камсамолец Мікалай Герасімаў перагаварваўся з таварышамі і не пачуў ніводнага слова выступаючага, а пасля скончэння дакладу пачаў апладыраваць. Зразумела, не з-за пачуцця ўдзячнасці выступаючаму, не, проста па яго словах, яму «так хацелася». Свае пажаданні ён паставіў вышэй за ўсё. Вышэй камсамольскага абавязку, вышэй хвалявання і пачуцця адказнасці за калектыў, у якім ён сам знаходзіцца. І зразумела, тут не прыходзіцца гаварыць аб абавязках камсамольца, тых абавязках, якія ён старанна вывучаў пры паступленні ў камсамол і якія забыў на камсамольскім сходзе, апрануўшы на сябе маску раўнадушша.

І тым больш нечакана, што гэты камсамолец быў выбраны ў новы склад камсамольскага камітэта юрфака! Праўда, у пераважнай большасці у камітэт выбраны дастойныя людзі: камуністы і камсамольцы Іван Сухаверх, Сяргей Пружаноўскі, Рыгор Жогаль, Ганна Бондарава.

Хацелася б пажадаць новаму складу камітэта камсамола вялікіх поспехаў у працы, дасягнення таго, каб камсамольская арганізацыя юрфака заняла вядучае месца сярод камсамольскіх арганізацый універсітэта.

Аляксандр КУХАРАЎ,
нам. сакратара камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна.

